*Г. Г. Шымялевіч*

# РОЛЯ ДЭКОРУ Ў ВОБРАЗНАЙ СТРУКТУРЫ АРХІТЭКТУРЫ ЭКЛЕКТЫЗМУ Ў БЕЛАРУСІ XIX ст.

Аналізуючы своеасаблівасць архітэктуры другой паловы XIX – пачатку XX ст., практычна ўсе даследчыкі падкрэсліваюць яе адмысловы дэкаратывізм. Вельмі часта, вывучаючы той ці іншы архітэктурны помнік, навукоўцы абмяжоўваюцца апісаннем яго дэкаратыўных элементаў, апраўдваючы сябе тым, што для эклектычнай архітэктуры ўвогуле быў уласцівы «адрыў дэкору ад канструкцыі будынка» [1, с.170]. Такі погляд прадстаўляецца спрошчаным, паколькі катэгорыі «канструкцыя» і «дэкор» у архітэктуры знаходзяцца ў складаным узаемадзеянні, і тым не менш бясспрэчна, што сутнасць архітэктуры эклектызму не ў канструкцыях і прасторавых схемах, а ў дэкаратыўным выяўленні знешняй пластыкі скульптурна-жывапіснага плана, прасцей кажучы, – дэкору.

Паняцце архітэктурнага дэкору, як правіла, азначае ўсю сукупнасць мастацкіх сродкаў арганізацыі архітэктурнай паверхні, якія не звязаны непасрэдна з функцыянальнымі і канструктыўнымі патрабаваннямі будынка. Дэкор нібыта дапаўняе ўжо «гатовую» структуру з мэтай яе аздаблення. Такое аднабаковае разуменне дэкору мінімізіруе яго ролю: аздабленне трактуецца толькі як другасны, неабавязковы кампанент архітэктуры.

Дэкор прадстаўляецца вельмі істотным кампанентам архітэктуры, які трэба разглядаць двухбакова. З аднаго боку, дэкор, сапраўды, дапасуецца да структуры нібыта «звонку», а значыць, у кантэксце архітэктурнай формы ён можа быць неабавязковым, нават у нейкай меры выпадковым. У прымяненні дэкору архітэктар мае параўнальна вялікую ступень свабоды. З іншага боку, дэкор абавязкова павінен быць «прымальным» у адпаведнасці з пэўнымі патрабаваннямі, якія прад’яўляе структура. Такім чынам, дэкор і структура звязаны паміж сабой даволі цеснымі сувязямі: дэкор заўсёды падпарадкоўваецца логіцы архітэктурнага формаўтварэння. Дэкор уяўляе сабой завяршэнне архітэктурнай формы, той знешні, апошні ўзровень (слой) пластычнай і колеравай дэталізацыі, які надае форме індывідуальнасць.

Тэарэтычная распрацоўка гэтай праблемы належыць амерыканскай даследчыцы Анн-Мары Санковіч [2], якая зрабіла спробу

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

выявіць суадносіны канструкцыі (*structure*) і дэкору (*ornament*). На яе думку, дэкор не можа існаваць у адрыве ад структуры. Калі разглядаць дэкор сам па сабе, ён непазбежна фігуруе ў выглядзе асобных фрагментаў, у якіх, гаворачы метафарычнай мовай, як у кавалачку люстэрка, адбіваецца цэласны вобраз архітэктурнага твора [2, с.701]. Архітэктурны дэкор атрымлівае завершанасць толькі ў сукупнасці з цэласнай структурай – канструкцыяй.

Такім чынам, памянёны вышэй «адрыў» дэкору ад канструкцыі немагчымы, бо ў пары канструкцыя/дэкор мы маем справу зусім не з раўназначнымі існасцямі. З аднаго боку, падпарадкаванае значэнне ў суадносінах канструкцыя/дэкор мае дэкор – паколькі ён, зразумела, не можа існаваць незалежна, сам па сабе. З другога боку, менавіта дэкаратыўная канцэпцыя будынка дазваляе выявіць яго структуру. Прыгадаем, што ў архітэктурнай тэорыі існуюць паняцці так званага «актыўнага» дэкору (такі дэкор адпавядае канструкцыі пабудовы, звязаны з яго функцыяй і формай) і «пасіўнага» дэкору – неканструктыўнага і атэктанічнага. У большасці выпадкаў правесці мяжу паміж пасіўным і актыўным дэкорам нельга. Як тэктанічны, так і атэктанічны дэкор, як правіла, мяняе наша ўяўленне аб структуры збудавання.

Яшчэ адзін важны аспект праблемы – семантыка і генезіс эклектычнага дэкору. Падвяргаючы стылізацыі дэкаратыўныя матывы і прыёмы, запазычаныя з арсенала даўнейшага дойлідства, архітэктура эклектызму стварае адмысловыя мастацкія вобразы. Пры гэтым архітэктар звязвае форму-прататып з пэўнымі ідэямі, абапіраючыся на свае ўяўленні аб такіх формах, як аб сімвалах, знаках.

У навуковай літаратуры даўно і трывала замацавалася паняцце «фасаднасці» ў характарыстыцы эклектычнага дэкору. Аднак гэта хутчэй адмысловая метафара, а не навуковы тэрмін – перш за ўсё з-за таго, што слова «фасаднасць», як правіла, служыць адмоўнай характарыстыкай (фасадным называюць дэкор, «адарваны» ад канструкцыі збудавання, штучна накладзены на тэктанічную сістэму, неарганічны; на думку многіх даследчыкаў, такі дэкор ужо паводле вызначэння няўдалы). Тым не менш канцэпцыя эклектычнага дэкору, заснаваная на раскрыцці сувязей паміж дэкорам і канструкцыяй эклектычнай архітэктуры, прымушае больш уважліва прааналізаваць кампазіцыйныя, семантычныя і дэкаратыўныя прынцыпы фасадных кампазіцый другой паловы XIX – пачатку XX ст.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Найбольш яскрава характэрныя для эклектызму прынцыпы пабудовы фасаднага дэкору праявіліся ў збудаваннях новых для сярэдзіны XIX ст. тыпалагічных груп – будынкаў камерцыйных і банкаўскіх устаноў, даходных дамоў і гасцініц, увогуле ў гарадской забудове. Для ўсіх гэтых помнікаў характэрная адмысловая кампазіцыйная сістэма фасадаў з раўнамерна рытмізаваным чляненнем праёмаў і архітэктурных дэталяў. Надзвычайную важнасць у арганізацыі фасаднай плоскасці – з улікам таго, што эклектызм увогуле імкнуўся да звышдэкаратыўнасці, перанасычанасці дэталямі, – адыгрывала рытмічная арганізацыя.

У дэкоры эклектычных фасадаў надзвычай рэдка сустракаюцца ўнікальныя элементы – гербы, картушы, няпарныя скульптуры або выяўленчыя матывы. Заканамернасцю хутчэй можна назваць паўтараемасць элементаў, якія, нібыта своеасаблівы арнамент, размяшчаюцца вертыкальнымі або гарызантальнымі радамі на ўсёй плоскасці фасада або яго часткі (рызаліта, яруса). Такімі элементамі з’яўляюцца вокны і матывы афармлення аконных праёмаў (ліштвы, сандрыкі, броўкі); элементы вертыкальнай рытмічнай арганізацыі (лапаткі, пілястры, калонкі); элементы гарызантальнай рытмічнай арганізацыі (цягі, карнізы, трыгліфна-метопныя і зубчастыя фрызы, аркатурныя паясы); арнаментальныя матывы.

Увогуле эклектычнай архітэктуры Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. быў уласцівы павышаны дэкаратывізм, тэндэнцыя шчыльнага запаўнення плоскасці фасадаў рытмічна арганізаванымі дэкаратыўнымі элементамі, арнаментальнымі кампазіцыямі і матывамі гарызантальнага/вертыкальнага чляненне. Як правіла, асобныя матывы і формы эклектычнага дэкору былі арганізаваныя ў цэласны кантэкст, часам даволі складаны па сваёй пластыцы і рытмах, і тым не менш па прыродзе сваёй аднародны.

---


1. *Николаева, Н.* К проблеме стилизации в декоративном искусстве / Н. Николаева // Человек, предмет, среда: вопросы развития советского декоративного искусства 60–70-х гг. – М.: Изобразительное искусство, 1980. – С. 162–202.

2. *Sankovitch, A.-M.* Structure/ornament and the modern figuration of architecture / A.-M. Sankovitch // Art Bulletin. – 1998. – Vol. 80, Issue 4. – P. 687–718.


БИБЛИОТЕКА БГУКИ